Адышоў у вечнасць кс. Францішак Кукліс

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
21.11.2021 00:00



6 лістапада ў Літве адышоў у вечнасць кс. Францішак Кукліс, святар Гродзенскай дыяцэзіі. У апошнія гады ён служыў у Вілкавішскай дыяцэзіі. Кс. Францішак нарадзіўся 2 красавіка 1970 года, паходзіў з парафіі Найсвяцейшай Панны Марыі Ружанцовай у Дзевенішках (Літва). Прэзбітэрскае пасвячэнне атрымаў 19 мая 2001 года ў катэдральным касцёле св. Францішка Ксаверыя ў Гродне з рук біскупа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча. †

Пасля пасвячэння святар служыў у Гродзенскай дыяцэзіі: у парафіі св. ап. Якуба ў Цудзенішках (дэканат Ашмяны), парафіі Узвышэння Святога Крыжа ў Лідзе, а таксама ў парафіі св. Юды Тадэвуша ў Прывалцы (дэканат Гродна-Усход). Затым у 2007 годзе выехаў у Літву, дзе служыў да моманту смерці.

Пахаванне спачылага святара адбылося 9 лістапада ў яго роднай парафіі ў Дзевенішках (Віленская архідыяцэзія).

Просьма Пана Бога, каб аказаў памерламу сваю міласэрнасць і адарыў вечным шчасцем!